# Як Петрык мароз напалохаў

*Міхась Даніленка*

Размаляваў мароз шыбы ў хаце дзівоснымі ўзорамі. Петрык прыгледзеўся і ўбачыў шырокія лісты, срабрыстыя зоркі, калматыя лапкі як у той сасны, што расце за іхнім дваром.

— Можа, пойдзеш, сынок, пагуляеш? — спытала маці ў Петрыка і дастала цёплы шалік

— Ой, холадна. Марозу баюся, — адказаў Петрык.

— А чаго яго баяцца? Напалохай яго, дык мароз адразу ўцячэ з нашага двара.

Здзівіўся Петрык: як гэта можна мароз з двара прагнаць?

Маці абвязала Петрыку шыю шарсцяным прыгожым шалікам, надзела яму цёплыя рукавічкі.

— А цяпер вазьмі сваю рыдлёвачку, — сказала яна. — Мароз хітры: у снег зашыўся. А мы і адтуль выганім…

…Маці ўзяла на двары шырокую фанерную лапату і спрытна пачала расчышчаць замеценую за ноч дарожку да хлява. Хітры Мурзік прыціх у будцы: баяўся вылазіць на мароз, — толькі чорны нос быў відаць. Мароз шчыпаў Петрыка за шчокі, нос. Зліпаліся павекі. Калі ён гаварыў, з рота вылятала клубочкамі пара.

— Я таксама буду сцежачку расчышчаць, — прапанаваў Петрык.

Хлопчык нагінаўся, падхопліваў рыдлёвачкай снег і адкідаў яго ўбок. Яшчэ крок, яшчэ…

А снег спрасаваўся — нялёгка яго было адкідваць. Маці ласкава паглядала на Петрыка, у якога расчырванеўся твар, а шапка збілася на патыліцу.

— Дзе ж мароз той? — дзівіўся Петрык, калі роўная сцяжынка пралегла ад ганка аж да Мурзікавай будкі.

— А ён уцёк, баязлівец, — смяялася маці. Спалохаўся нашых рыдлёвак і пабег за агароды у лес.

І праўда, не адчуваў Петрык марозу. Ён зняў рукавічкі і нават развязаў шапку. Мурзік выскачыў з будкі і, як ашалелы, з радасным брэхам бегаў па расчышчанай дарожцы.